валай, роўнай па значнасці дзеянню і часу.

Дзеянне – катэгорыя эстэтычная, якая ўключае харэаграфічны тэкст эстраднага нумара. У мастацкіх адносінах дзеянне найбольш гнуткае. Яно схільнае да змен, што выкліканы знешнімі і ўнутранымі прычынамі, якія вызначаюцца як індывідуальным характарам творчасці артыстаў або калектыву, так і асаблівасцямі глядацкага ўспрымання.

Найбольш пастаяннай з'яўляецца катэгорыя часу. Гэта фізічны, загадзя вызначаны перыяд сцэнічнага існавання артыстаў, абумоўлены хронаметрыяй музычнага твора, пад які выконваецца танец. Калі час зацягнуты, узнікаюць харэаграфічныя расцягнутасці, губляецца ўспрыманне, а значыць, і цікавасць гледача да нумара; наадварот, залішне сціснуты час нумара не дае магчымасці раскрыць змест твора.

Такім чынам, мы лічым (а глядач успрымае) эстрадны нумар адзінкай мастацкай структуры, дзе кожнае звяно залежыць ад іншага і існуе толькі ў сувязі з ім. Калі ж ланцуг узаемаабумоўленых звёнаў перапыняецца, нумар не можа быць паўнацэннай адзінкай мастацтва.

*А.У.Карэцкі*

## СУЧАСНАЯ НАВУКОВАЯ КАНЦЭПЦЫЯ МУЗЕЕФІКАЦЫІ МІРСКАГА ЗАМКА

Пытанне аб захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку і помнікаў архітэктуры, востра стаіць у наш час. Яго вырашэнне ў значнай ступені залежыць ад таго, наколькі ўдала і актыўна гэтая спадчына ўключана ў сучаснае жыццё. Лепш за ўсё захоўваюцца тыя помнікі архітэктуры, для якіх знойдзена функцыя, што адпавядае іх архітэктурна-планіровачнаму вырашэнню. Найбольш паспяховым уяўляецца выкарыстанне будынкаў як музейна-выставачных устаноў, бо ўмовы работы музея найбольш поўна адпавядаюць умовам іх захаванасці, адначасова ператвараючы помнікі архітэктуры ў аб'екты экспанавання.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мірскі замак – адзін з самых каштоўных і унікальных помнікаў не толькі ў Беларусі, але і ў свеце. У 2000 г. ён быў уключаны ў спіс помнікаў сусветнага значэння. Пытанне аб будучым лёсе Мірскага замка ўзнімалася ў 1970–1980-х гг. Аднак мінула шмат гадоў, адбыліся значныя змены ў грамадстве і ў самой рэстаўрацыі замка. З'явілася неабходнасць па-новаму перагледзець раней створаны праект. Такія спробы адбываліся на працягу 1990-х гг., і кожны раз вызначаліся новыя кірункі і прапановы па музеефікацыі Мірскага замка.

Апошні перагляд праекта адбыўся 31 ліпеня 2002 г. на пашыраным пасяджэнні выязной калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, дзе было разгледжана пытанне аб навуковай канцэпцыі музеефікацыі Мірскага замка. Згодна з задумай аўтараў дадзенага праекта замак прадугледжваецца падзяліць на дзве зоны: музейную і апартаментную. Найбольшая ўвага надаецца менавіта музейнай зоне, бо музеефікацыі помніка адведзена прыярытэтнае значэнне ў плане эфектыўнага выкарыстання яго як аб’екта экспанавання, у якім адначасова будуць размешчаны музеі розных кірункаў. З гэтай нагоды на сучасным этапе рэстаўрацыйных работ у Мірскім замку найбольшая ўвага надаецца працы ў галоўным корпусе, у якім мяркуецца размясціць асноўную музейную экспазіцыю. Усе запланаваныя работы па музеефікацыі помніка будуць праводзіцца адначасова з рэстаўрацыйнымі.

Трэба адзначыць, што праца над стварэннем навуковай і мастацкай канцэпцыі па музеефікацыі замкавага комплексу пачалася яшчэ ў 2000 г. Як бачым, час яе распрацоўкі быў даволі працяглым. Гэта тлумачыцца тым, што ў нашай краіне няма вопыту па музеефікацыі такіх архітэктурных аб'ектаў, як замкі. Таму, каб не зрабіць вялікіх памылак, рабочая група, якая займалася распрацоўкай вышэйзгаданай канцэпцыі, улічвала розныя прапановы спецыялістаў як у музейнай сферы, так і навукоўцаў. У выніку была распрацавана навуковая канцэпцыя, якая ўключае два асноўныя прынцыпы па музеефікацыі Мірскага замка:

1. Замак як унікальны помнік гісторыі і архітэктуры.
2. Культура і мастацкая творчасць Беларусі XV–XX стст.

У адпаведнасці з першым прынцыпам маецца на ўвазе, што Мірскі замак будзе выкарыстоўвацца як аб’ект экспанавання і вывучэння, як унікальны шэдэўр беларускага мурава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага замкавага дойлідства. А экспазіцыя будзе прысвечана яго гісторыі, стылістыцы, уладальнікам, а таксама сувязі гісторыі Мірскага замка з гісторыяй краіны.

Экспазіцыя, афармленая згодна другому прынцыпу, размесціцца ў чатырох з пяці вежаў замка, а таксама ў Паўночным корпусе палаца.

Аглядаць усю экспазіцыю можна будзе у двух напрамках: па вертыкалі і па гарызанталі. Для гэтага будуць створаны спецыяльныя лесвіцы і прыстасаванні. Больш таго, наведвальнікам будучай музейнай экспазіцыі на выбар будуць прапанаваны тры аглядныя маршруты. Першы маршрут плануецца стварыць для масавых наведвальнікаў, другі – для тых, хто асабіста захоча агледзець усю экспазіцыю, і, нарэшце, трэці маршрут будзе створаны для тых людзей, якія добра ведаюць гісторыю Беларусі і замка. Ім дадаткова пакажуць іншыя цікавыя прадметы.

Разам з навуковай канцэпцыяй па музеефікацыі Мірскага замка калегіяй Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь быў зацверджаны і тэматыка-экспазіцыйны план для 70 залаў помніка. Згодна дадзенаму плану ўся экспазіцыя размесціцца наступным чынам:

1. Паўднёва-ўсходняя вежа: "Будаўніцтва, рэстаўрацыя Мірскага замка. Роля замка ў культуры Беларусі XV–XX стст."

2. Заходняя вежа (уязная): "Гістарычная хроніка на фоне Мірскага замка XV–XX стст."

3. Паўночна-заходняя вежа: "Падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў гісторыі замка. Архітэктурныя асаблівасці вежы".

4. Паўночна-ўсходняя вежа: "Мірскі замак у гравюрах XVII–XX стст."

5. Паўночны корпус палаца, першы паверх: "Вырабы гаспадарчага прызначэння беларускіх майстроў XVII–XX стст. Калекцыі замкаў Міра і Нясвіжа ў замках свету".

6. Паўночны корпус палаца, другі паверх: "Гісторыя і рэстаўрацыя Мірскага замка. Культура Міра XVI–XX стст."

7. Паўночны корпус палаца, трэці паверх: "Культура магнацкіх родаў Беларусі XVI–XVIII стст. на прыкладзе замка ў Міры".

Пералічаныя тэмы музейнай экспазіцыі Мірскага замка будуць асноўнымі пры яго музеефікацыі. Аднак трэба заўважыць, што, акрамя непасрэдна экспазіцыі, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

замку размесцяцца і дапаможныя службы. У іх ліку наступныя:

1. Паўночны палацавы корпус: бюро для экскурсаводаў; каса, музейная крама; залы для часовых выстаў, фае і канферэнц-зала.

2. Усходні палацавы корпус: фае і экспазіцыйныя залы замка, залы для часовых выстаў жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Што датычыцца камплектавання ўсёй экспазіцыі Мірскага замка, то тут перад распрацоўшчыкамі тэматыка-экспазіцыйнага плана ўзніклі цяжкасці. Прыкладна 80% прадметаў плануецца сабраць з прыватных збораў Нацыянальнага мастацкага музея, а таксама з калекцый іншых музеяў краіны. Мэтанакіраванае збіранне экспанатаў супрацоўнікі музея пачалі яшчэ ў 80-я гг. XX ст., але ж музею немагчыма сабраць такую вялікую калекцыю. Таму значная ўвага надаецца ахвераванням як з боку іншых музеяў, так і прыватных асоб і арганізацый. Важным кірункам у камплектаванні з'яўляецца абмен экспанатамі паміж музеямі Беларусі і сумежных краін, у прыватнасці Расіі. Работы ў гэтым кірунку актыўна вядуцца. Вырашаюцца пытанні і па фінансаванні. Мяркуецца, што грошы будуць паступаць па некалькіх каналах: з Міністэрства культуры, ахвераванні, з фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы мастацтва і культуры.

Асноўныя палажэнні сучаснай навуковай канцэпцыі музеефікацыі Мірскага замка былі ўхвалены на пасяджэнні выязной калегіі Міністэрства культуры летам 2002 г., аднак гэта не азначае, што яны застануцца нязменнымі. Як адзначыў міністр культуры Рэспублікі Беларусь, навуковую канцэпцыю трэба па магчымасці пашыраць. Такое стаўленне да яе даволі правамернае, бо ўсе акалічнасці, асабліва дробныя, нельга ўлічыць. Таму па меры ажыццяўлення музеефікацыі Мірскага замка будуць унесены неабходныя карэктывы і дапаўненні як у навуковую канцэпцыю, так і ў тэматыка-экспазіцыйны план.

1. *Гурин М.Ф.* Мир. – Мн.,1985.
2. *Калнін В.В.* Мірскі замак. – Мн., 2002.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Памяць:* Карэліцкі раён. – Мн., 2000.
4. *Ткачёв М.А.* Замки Белоруссии. – Мн., 1987.

*Ю.Г. Ксеневіч*

## МУЗЕЙ РЭВАЛЮЦЫІ БССР у 1926–1941 гг.

Поспех любога дзяржаўнага музея залежыць ад эфектыўнасці падтрымкі яго з боку дзяржавы. Менавіта дзяржава стварае ўмовы, неабходныя для развіцця музеяў. У першыя гады савецкай улады адметнай з'явай у развіцці музейнай справы было стварэнне музеяў новага тыпу – музеяў рэвалюцыі. У канцы 1920-х гг. колькасць гісторыка-рэвалюцыйных музеяў СССР, паводле архіўных даных і перыёдыкі тых гадоў, перавышала 100 [1]. Знаходзячыся ў сістэме Гістпарта, гэтыя музеі разглядаліся як важныя сродкі прапаганды камуністычнай ідэалогіі.

Дом-музей І з'езда РСДРП, які адкрыўся 14 сакавіка 1923 г. [2] у Мінску, стаў першым музеем, прысвечаным палітычнай гісторыі БССР. Праз тры гады, менавіта 2 мая 1926 г. [3], на асігнаванні СНК быў адкрыты Музей рэвалюцыі БССР (вул. Урыцкага, 4а) у двухпавярховым будынку плошчай 720 кв. м. [4] (цяпер вул. Гарадскі вал, на перакрыжаванні з вуліцамі Інтэрнацыянальнай і Валадарскага), а Дом-музей І з'езда РСДРП стаў яго філіялам.

Паводле распараджэння Бюро ЦК КП(б)Б ад 7 мая 1926 г. [6], на ЦВК БССР ускладаўся абавязак фінансавання Музея рэвалюцыі, а кіраўніцтва ім – на Гістпарт ЦК КП(б)Б. Арганізоўваліся камандзіроўкі ў абласныя цэнтры, а таксама ў Маскву і Ленінград з мэтай пошуку і збору матэрыялаў. Экспазіцыя музея будавалася па ўзоры Дзяржаўнага музея Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Петраградзе і Музея рэвалюцыі СССР у Маскве і ў асноўным уключала копіі матэрыялаў па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Расіі. Так, з 1300 экспанатаў у 1925 г. толькі каля 400 адносіліся да Беларусі [6]. Быў і беларускі аддзел, які меў арыгінальныя дакументы: фотаздымкі, партрэты, архіўныя матэрыялы, пракламацыі БСГ, Бунда, народнікаў. Час

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ